Наша ніва

13.09.2018

# Начная велапрагулка «Веласіпедыст, дай агню!»



22 верасня ў рамках Дня без аўтамабіля на вуліцы Леніна, якая ў гэты дзень ужо традыцыйна стане пешаходнай, адбудзецца вялікае гарадское свята. Днём гараджан чакаюць кірмашы, майстар-класы, выставы, кінапаказ і канцэрт, а ўвечары праспект Незалежнасці перакрыюць для велапрабегу «Веласіпедыст, дай агню!».

Аўтамабільны рух па вуліцы Леніна ад праспекта Незалежнасці да вул. Кірава будзе перакрыты 22 верасня з 6:00 да 24:00. Святочныя мерапрыемствы, прысвечаныя Дню без аўтамабіля, пачнуцца а 14:00 і скончацца позна вечарам яркім парадам альтэрнатыўных аўтамабілю сродкаў перамяшчэння.

**У праграме свята:**

- канцэртна-забаўляльная частка;

- пазнавальныя і актыўныя гульні для дзяцей;

- дэманстрацыя альтэрнатыўных аўтамабілям сродкаў перамяшчэння;

- конкурс на самы яркі ровар;

- выстава «Веласіпедыст і стыль»;

- бясплатнае абслугоўванне ровараў;

Кульмінацыяй мерапрыемства стане **велапрабег па праспекце Незалежнасці ад вуліцы Леніна да Нацыянальнай бібліятэкі**, да ўдзелу ў якім запрашаюцца не толькі веласіпедысты, але і ўладальнікі іншых экалагічных відаў транспарту — ролікаў, монаколаў, скейтбордаў, самакатаў, гіраскутараў, сігвэеў. **Прагулка па праспекце пачнецца а 21:00 і пройдзе ў спакойным тэмпе 15-18 км/г.** Для ўдзелу ў мерапрыемстве трэба абавязкова абсталяваць свае сродкі перамяшчэння святлівымі элементамі.

Свята арганізаванае Міністэрствам прыроды, Мінскім гарадскім камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Мінскім гарадскім упраўленнем МНС, УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, Камітэтам па адукацыі Мінгарвыканкама, Мінскім веласіпедным грамадствам, Цэнтрам экалагічных рашэнняў, Аховай птушак Бацькаўшчыны і іншымі арганізацыямі.

Мерапрыемствы прымеркаваныя да Еўрапейскага тыдня мабільнасці і падтрыманыя Еўрапейскім саюзам у межах праекта «Гарадскі веларух у Беларусі».

**Праграма:**

- 16:00 — урачыстае адкрыццё і дзіцячая праграма,
- 18:00 — выступ афіцыйных прадстаўнікоў адміністрацыі Мінска,
- 18:00 — канцэрт гуртоў **NAVI,:B:N:, «Радыёхваля»; выступ пластычнага тэатра «ІнЖэст»**; экстрым-выступ веласіпедыстаў і ролераў,
- 20:00 — шоу-конкурс святлівых ровараў «Веласіпедыст, дай агню!». Уключы фантазію: падсвятлі свой ровар святлодыёднымі лямпачкамі, стужкамі, гірляндамі або ліхтарыкамі, стань прыкметным у цемры і атрымай за гэта прыз,
- 21:00 — самая «яркая» велапрагулка года па праспекце Незалежнасці! (Для ўсіх удзельнікаў абавязкова наяўнасць ліхтарыкаў).

Уваход вольны!